# ВЫБІРАЦЬ, ДЫК КАРАЛЕВУ!

**Міжнародны фінал конкурсу «Каралева студэнцтва» трыумфальна вяртаецца ў Беларусь. Гэтаму доўгачаканаму моманту садзейнічала леташняя перамога ў конкурсе Вікторыі Вараб'ёвай — студэнткі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.**


Фота з сайта БРСМ.

Фінал XXXI Міжнароднага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2022» адбудзецца ў Мінску 23 сакавіка на базе спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэта абсалютна новая і нестандартная пляцоўка адкрывае для арганізатараў і рэжысёрска-пастановачнай групы дадатковыя магчымасці і дазволіць прыўнесці ў фінальнае шоу яшчэ больш цікавінак і навацый.

Папярэдні раз канкурсанткі сустракаліся на міжнародным фінале ў Мінску ў 2018 годзе пад брэндам «Каралева Вясна», пасля чаго фіналістак двойчы сустракаў расійскі Стаўрапаль. Быў апрабаваны і анлайн-фармат.

За тытул «Каралева студэнцтва — 2022» у творчых і інтэлектуальных спаборніцтвах будуць змагацца дванаццаць пераможцаў нацыянальных этапаў праекта — па шэсць ад Беларусі і Расіі.

Нашу краіну прадставяць фіналісткі рэспубліканскага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва Беларусі — 2022».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**